2. Жыцця адвечны лад: Беларускія народныя прыкметы і павер‘і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

3. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Бел. навука, 2003.

4. Катовіч, А. Зімовыя святы : нарысы / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. – 119 с.

5. Котович, О. В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

6. Ліцвінка, В. Святы і абрады беларусаў / В. Ліцвінка. – Мінск : Полымя, 2008. – 193 с.

7. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 2002. – 237 с.

8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш.; складальнік Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 910 с.

9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2-х кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; аўт. Ідэі Т. Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 608 с.

10. Будзьма беларусамі! Калядны карнавал ―Конікі" у Давыд-Гарадку [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://budz ma.by/news/kalyadny-karnaval-koniki-w-davyd-haradku-fotarepartazh.html. – Дата доступу : 15.01.15.

Галюк Е. Г., БГУКИ, студент 114 группы
очной формы обучения
Научный руководитель – Котович О. В.,
старший преподаватель

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## МАСЛЕНІЧНЫ АБРАД «КАЛОДКІ» ЯК СРОДАК АГУЛЬНАРОДАВАГА І СЯМЕЙНАГА ВЫХАВАННЯ

Выхаванне беларусаў на працягу многіх стагоддзяў, пачынаючы з калыскі, было шчыльна звязана з жыццём, побытам, гаспадарчай дзейнасцю народа, абапіралася на яго жыццёвыя прынцыпы. Кожны селянін разумеў ролю выхавання, бо ад яго залежыла развіццё розуму, волі, характару дзяцей. Звесткі аб традыцыйных формах і метадах сямейнага выхавання беларусаў сёння мы знаходзім у вуснай народнай творчасці, звычаях, абрадах, дзіцячых гульнях [1, с. 121].

Адным з патрабаванняў і умоў сямейнага выхавання было ўвасабленне ў свядомасці падрастаючага пакалення жыццёвай неабходнасць працягу роду. Амаль у кожным календарным свяце былі абрадавыя дзеянні, накіраваныя на тое, каб моладзь шлюбнага ўзросту падштурхнуць да стварэння сваёй сям‘і і нараджэння дзяцей. Яскравым прыкладам такога дзеяння з‘яўляецца абрад ―Калодкі”, які праводзіўся ў час святкавання Масленіцы: ―Быў звычай адзявання ―калодак” (істужак з кветкамі), найчасцей стасаваных да хлопца, што не спяшаўся жаніцца, ці да дзяўчыны, якая засядзелася ў дзеўках” [4, с. 43].

―Калодка” магла выглядаць па-рознаму: рознакаляровая лента, пояс, смаліна, салёная сялёдка, якія прывязвалі тым, хто дасягнуўшы шлюбнага ўзросту, не жаніўся, што лічылася невыкананнем свайго грамадскага абавязку.

У сваім манаграфічным даследванні «Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў» Т. Кухаронак прыводзіць прыклады яшчэ некаторых варыянтаў «адорвання» хлопцаў калодкай. «Калодка» магла мець форму драўлянага крыжа; гэта магла быць стужка, складзеная ў бант, «васьмёрку», «зорку» і нават шасці- або васьміпялёсткавую кветку; «калодкай» так сама магло быць трохметровае палена, да абодвух канцоў якога мацавалі вяроўкі. Калодка была цяжкой і валачы яе па вёсцы гурту жанчын дапамагалі дужыя хлопцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследчык выказвае меркаванне аб тым, што калодка не толькі стымулявала ўступіць у шлюб, але і спрыяла аднаўленню ўрадлівасці зямлі, ажыўленню вегетатыўных працэсаў азімых культур [6, с. 81-82].

На Віцебшчыне звычай прывязвання ―калодак”, ці чапляння ―бірак” быў найбольш распаўсюджаны. Хлопцам ―калодку” прывязвалі да нагі ці вешалі на шыю, каб хутчэй ажаніліся. Пераборлівым дзеўкам вешалі на шыю выра6ленага з дрэва (бульбы, бурака) ―кракадзіла”, або сялёдку. Каб заахвоціць да будучага замужжа маладым дзеўкам вешалі цукеркі, стужкі, кветкі, абаранкі і д.п. іншыя прылады. У Дубравенскім раёне гурт жанчын ішоў па вуліцы з масленічнымі песнямі і рабіў абыходы двароў. У той хаце, дзе жыў нежанаты, але ўжо даволі сталага ўзросту хлопец або малады мужчына, яму абавязкова вешалі ―калодку”, а ён павінен быў адкупіцца грашыма, бутэлькай гарэлкі, цукеркамі і д.п. [8, с. 69].

Звычай ―чапляць калодку” быў вельмі распаўсюджаны сярод моладзі і на Магілёўшчыне. ―Калодкай” тут з‘яўляўся кавалак нятоўстага бервяна, ўпрыгожаны стужкамі і кветкамі з рознакаляровай паперы. А старыя людзі расказвалі, што існавала ―Калодку ад дзевак” і ―Калодку ад хлопцаў”. Марыя Салодкая з вёскі Конанаўка удакладняе: ―На Масленку хлопцам, каторыя ня жэнюцца і ўжэ ў гадах, дзеўкі калодку чапляюць на шыю. Збяруцца пяць-шэсць, здолеюць хлопца і прывяжуць калодку. А ён тады ўжо адкупляецца” [7, с. 43]. ―Калодка ад хлопцаў” выглядала па іншаму. Кацярына Шчарбакова з вёскі Нікіцінічы успамінае: ―Хлопцы цягалі калодку – такое бервяно вялікае. Украсяць бутылку цвятамі з бумагі, кругом абараначкаў нацапляюць і ленту, …, і ў хату ідудь да дзеўкі… Бервяно ў парозе кінуць, бутылку на стол, і бацька той дзеўкі, к каму прышлі, знаіць, што дзелаць: закуску на стол, шчэй гарэлкі, а тады гуляюць, песні пяюць…А як пачастунак не даш, бервяно кінуць у хаце – выцягвай як хочаш сам” [7, с. 43].

На Гомельшчыне ―цяганне калодкі” вядома не ўсюды. ―Калодку цягалі, хто сільнейшы, хто каго падолее” – узгадвае Ульяна Прыходзька з вёскі Смалегаў. Вядомы выпадкі, са слоў Лідзіі Сцецовай з пасёлка Кругавец-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калінін: ―… як хлопец не жаніўся, яму прывязвалі ступу к нагам, і штоб ён адкупліваўся… Ступа ў кожнай хаце была. Ілі ступа, ілі такая калодка таўставаценькая, адпіліная. Ідуць жа, знаюць, дзе такі хлопеу. Большай часьцю бабы…" [10, с. 160-161].

У цэнтры ўвагі на Масленіцу на тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі былі маладыя, якія нядаўна ўзялі шлюб, што на думку А.В. Катовіч і Я. Крука павінна было ―спрыяць цяжарнасці і перасцерагчы маладую жонку аднегатыўных уздзеянняў на ўвесь перыяд цяжарнасці" [2, с. 91]. Надзея Шанькова з вёскі Маслёнкі расказвае: ―Адныя жанчыны цягнулі калодку: такая вот палка, яны за яе вяроўку прывяжуць і цягнуць за сабой. … хазяін іх доўжан прыгласіць у хату. А есьлі не прыглосіць, не дасьць выкупу, значыць, хазяіну нявестка не панравілась… Вот хазяін выходзіць і запрашае іх у хату… Яны як выпілі, як пайшлі ў пляскі, мол, дужа нявестка харошая, бо багаты выкуп далі. Па выкупу апрэдзялялі нявестку: ці хароша, ці не" [9, 116]. У большасці вёсак гэтага рэгіёна абрад ―Калодкі" захаваўся як жартоўны розыгрыш. Галіна Лук'янцава з вёскі Каменка распавядала: ―Хадзілі сусед к суседу, як той кажа, калодкі прывязваць. Эта сьпічачную каробку прывяжуць ззаду… Вот так і зьбяруцца, і атмячаюць Масьленіцу" [9, 116-117].

Такое абрадавае «пакаранне», як абрад «Калодкі» мела пад сабой пэўную падставу. Яшчэ на Каляды, у час абыходу вёскі калядоўшчыкамі, у кожнай хаце, дзе была моладзь перадшлюбнага ўзросту спявалі велічальныя песні, змест якіх папераджаў, што ўжо прыйшла пара жаніцца або выходзіць замуж, каб нараджаліся дзеткі. Пасля двухтыднёвага зімовага святкавання, падчас якога забаранялася спраўляць вяселлі (у народзе казалі, што ―На Каляды толькі ваўкі жэняцца" [3, с.270]), пачынаўся адзін з самых актыўных перыядаў сватаўства і правядзення вяселляў, якія атрымаў назву ―мясаедныя вяселлі" [5, с. 130]. Невыкананне або ігнараванне калектыўнага звароту да маладой асобы на Каляды заканчвалася публічным пакараннем і асмяяннем на Масленіцу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У жаночага гурта, які абыходзіў вёску на Масленіцу, была рэгулюючая і стымулюючая функцыя, бо натуральным патрабаваннем да кожнага чалавека, які прыйшоў у гэты свет лічылася захаваць, прадоўжыць і пашырыць свой род і тым самым захаваць увесь род. У вёсцы лічылі вялікай абразай, калі масленічны гурт праходзіў міма якой-небудзь хаты і не спыняўся для святочнага віншавання. Гаспадары маглі ўгледзець у такім ігнараванні наўмысны падтэкст, нават нешта накшталт наслання родавага праклёну.

Такім чынам, у цэнтры ўвагі абраду ―Калодкі" былі хлопцы і дзяўчаты шлюбнага ўзросту, якія па розных прычынах своечасова не стварылі сям'ю, тыя, якія толькі-толькі абралі шлюб і маладыя цяжарныя жанчыны. У больш позні час абрад набыў гульнёвы характар. Штогадовае рэгуляванне адносін у межах вясковай абшчыны мела двухбаковую накіраванасць. З аднаго боку, людзі выказвалі падзяку за разуменне неабходнасці своечасовага ўключэння ў склад захавальнікаў і прадаўжальнікаў роду, з другога — той, хто з-за нейкіх прычын на момант выканання абрадавай дзеі не абраў шлюб, падвяргаўся публічнаму пакаранню, зразумела, не фізічнаму, а жартоўна-сімвалічнаму, але ад гэтага не менш выніковаму. Беларус разумеў, што чалавек прыйшоў у гэты свет, каб аднавіць ланцужок жыцця на новым этапе родавай эстафеты, а тых, хто не імкнуўся дасягнуць гэтай мэты не заставаўся без увагі і трапляў пад выхаваўчыя меры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Беларусы. Т. 5. Сям'я / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак і інш.; Рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 375 с.: іл.

2. Веснавыя святы: нарысы. У 2 кн. Кн. 1 / А. Катовіч, Я. Крук ; маст. У. У. Васюк, А. Л. Баранаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2005. – 359 с.

3. Виноградова, Л. Н. Запреты (табу) / Л. Н. Виноградова, С. М. Толстая // Славянские древности: Этимологический словарь в 5-ти

томах / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М. : Междунар. отношения, 1999. – Т. .2. – С. 269 – 273.

4. Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / уклад., класіф., сістэм. матэр. і камент. А.І. Гурскага; уступ. арт. А.І. Гурскага, А.С. Ліса. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

5. Котович, О. В. Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры : [научное издание] / О. В. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

6. Кухаронак, Т. І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 237 с.

7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 1 Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка і інш. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 797 с.

8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]; складальнік Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 910 с.

9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2010. – 847 с.

10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. Гомельскае Палессе і Падняпроўе / У 2 кн. Кн. 1 / Т. В. Валодзіна [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 910 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гануленко Д. В., БГУКИ, студент 313к группы
очной формы обучения
Научный руководитель – Кривошеева С. В.,
кандидат искусствоведения, доцент кафедры